ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
8 января 2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму” (далей – Фестываль).

2. Фестываль праводзіцца ў мэтах усебаковага садзейнічання працэсу адраджэння, захавання і трансляцыі аўтэнтычнага народнага танцавальнага мастацтва, развіцця і прапаганды традыцыйнай танцавальнай спадчыны, папулярызацыі лепшых узораў харэаграфічнага народнага мастацтва з улікам фактару лакальнай спецыфікі і самабытнасці, далучэння малодшага пакалення да гісторыка-культурнай спадчыны краіны і аўтэнтычнага танцавальнага фальклору, фарміравання ў дзяцей і моладзі нацыянальнай самасвядомасці, каштоўных напрамкаў беларускага грамадства ў накірунку асэнсавання значнасці традыцыйнай творчасці ў сістэме танцавальнай беларускай культуры, узмацнення творчых сувязяў паміж фальклорнымі танцавальнымі калектывамі.

3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”), аддзел культуры Лідскага райвыканкама (Дадатак 1).

4. Праграма Фестывалю ўключае: урачыстае адкрыццё; конкурс беларускіх народных побытавых парных танцаў; канцэрт фальклорных калектываў; майстар-клас па побытавых танцах; флэшмоб “Танцуем разам”; працу дзіцячай пляцоўкі з фальклорнымі гульнямі і забавамі; выстаўку-продаж вырабаў майстроў народнай творчасці аддзелаў рамёстваў і традыцыйнай культуры раённых Цэнтраў культуры (рамёстваў) і народнай творчасці.

5. Фестываль праводзіцца 24 мая 2025 г. на базе філіяла “Дзітвянскі Дом культуры” дзяржаўнай установы “Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці” (вул. Ленінская, 4, аг. Дзітва, Лідскі раён).

6. У рамках Фестывалю праводзіцца конкурс беларускіх народных побытавых парных танцаў (далей – Конкурс) у чатырох

узроставых катэгорыях: А (7-10 год); Б (11-17 год); В (18-50 год); Г (ад 51 года).

7. Пры наяўнасці выканаўцаў Конкурсу ва ўзросце да 7 год магчымы іх удзел па асобных умовах.

8. Выканаўцы Конкурсу прадстаўляюць варыянты (з захаваннем мясцовага адметнага выканальніцкага стылю) праграмных танцаў:

катэгорыя А: полька “Карэлафінская”, “Нарэчанька”, “Мальвіна”, “Яблычка”, “Лявоніха”;

катэгорыя Б: “Нарэчанька”, полька “Бабачка”, “Лявоніха”, “Грачанікі”, “Кракавяк”, “Какетка”;

катэгорыя В: полька “Мясцовая”, “Кракавяк”, “Каханачка”, “Дзеўка ў сенях”, “Падыспань”, “Лысы”, “Лявоніха”;

катэгорыя Г: полька “Мясцовая”, “Лысы”, “Каханачка”, “Вальс”, “Кракавяк”.

9. Для ўдзелу ў Конкурсу запрашаюцца ўдзельнікі аматарскіх калектываў устаноў культуры, агульнаадукацыйных устаноў, дадатковай, вышэйшай і сярэдняй адукацыі вобласці.

10. Не дапускаюцца да ўдзелу ў Конкурсу кіраўнікі і ўдзельнікі з прафесійнай харэаграфічнай адукацыяй!

11. Пераможцаў Конкурсу вылучае журы (Дадатак 2). У кожнай з 4-х узроставых катэгорый журы вылучае лаўрэатаў I, II, III ступені, якія ўзнагароджваюцца дыпломамі ў рамках і прызамі (кожнаму ўдзельніку пары).

12. Журы пакідае за сабой права ў межах агульнага прызавога фонду аб’ядноўваць, дзяліць прызавыя месцы паміж удзельнікамі розных узроставых катэгорый.

13. Журы ўзнагароджвае ўдзельнікаў Фестывалю спецыяльнымі прызамі і дыпломамі ў рамках (кожнаму ўдзельніку пары) у наступных намінацыях:

“Самая юная пара”;

“За адпаведнасць мясцоваму танцавальнаму стылю”;

“За дакладнае веданне кампазіцыі побытавага танца”;

“За непасрэднасць і выразнасць вобразна-пластычнага самавыяўлення”;

“За майстэрства імправізацыі падчас выканання побытавага танца”;

“Прыз глядацкіх сімпатый”;

“За пераемнасць народных традыцый”;

“Лепшая этнаграфічна-рамесніцкая экспазіцыя (фотазона)”.

14. Рашэнне членаў журы па выніках Фестывалю фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней

10 каляндарных дзён з дня правядзення Фестывалю на афіцыйным сайце ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

15. Лаўрэаты, I, II, III ступені прымаюць удзел у Рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва “Берагіня-2026” (ліпень, г.п. Акцябрскі Гомельскай вобласці).

16. У выпадку адказу ад удзелу лаўрэаты пазбаўляюцца прызавых месцаў і прызоў.

17. У канцэрце фальклорнага мастацтва, майстар-класах па побытавых танцах прымаюць удзел спецыялісты і калектывы ўстаноў культуры клубнага і змяшанага тыпаў Гродзенскай вобласці, усе жадаючыя.

18. Касцюмы, абутак, галаўныя ўборы ўдзельнікаў Фестывалю павінны адпавядаць варыянтам арыгіналаў або копій традыцыйных народных касцюмаў сваёй мясцовасці.

19. На працягу ўсёй конкурснай праграмы ў якасці музычнага суправаджэння аргкамітэт забяспечвае акампанемент музычнага інструментальнага ансамбля.

20. Заяўка на ўдзел у Фестывалі (Дадатак 3) дасылаецца ў ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” з паметкай “Танцуем па-даўнейшаму” да 15 красавіка 2025 г. на электронную пошту: info@gromc.by. Кантактныя тэлефоны: +375 (152) 687934; +375 (152) 623792.

21. Фінансаванне выдаткаў на правядзенне Фестывалю ажыцяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”.

22. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуецца: аплата работы членам журы, праезд членаў журы, набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, рамак для дыпломаў, выраб дыпломаў, набыццё тэматычных рал апаў.

23. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

24. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў выканаўцаў і калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам і калектывам не выплачваюцца.

25. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення Фестывалю, а таксама пераносіць дату правядзення (у іншыя тэрміны).

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Леўшунова Н.Ф. | начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама, *сустаршыня аргкамітэта;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні аргкамітэта*; |
| Вайцюкевіч Н.М. | галоўны спецыяліст аддзела культуры Лідскага райвыканкама; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Троцкая В.Р. | дырэктар ДУ “Лідскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”

# СКЛАД ЖУРЫ
абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”
(конкурс беларускіх народных побытавых парных танцаў)

| | |
|---|---|
| Каліноўская А.Т. | грамадскі эксперт у сферы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, выкладчык Школы традыцыйнага мастацтва намеснік, *старшыня журы*; |
| Выскварка С.Г. | загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела ДУК “Любанскі раённы цэнтр культуры”, этнахарэограф, *сустаршыня журы*; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні журы;* |
| Леўшунова Н.Ф. | начальнік аддзела культуры Лідскага райвыканкама; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама |

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю-свята побытавых танцаў “Танцуем па-даўнейшаму”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік (загадчык) аддзела (сектара) культуры рай(гар)выканкама
“___” _______________ 2025 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзел у абласным фестывалі-святе побытавых танцаў
“Танцуем па-даўнейшаму”
(конкурс беларускіх народных побытавых парных танцаў)

ДЛЯ ПАРЫ-ВЫКАНАЎЦЫ

| **Партнёр** | **Партнёрка** |
|---|---|
| 1. Імя і прозвішча | |
| | |
| 2. Дата нараджэння | |
| | |
| 3. Месца нараджэння і пражывання | |
| | |
| 4. Месца працы (вучобы), пасада (клас) | |
| | |
| 5. Прафесійная адукацыя (спецыяльнасць і назва навучальнай установы) | |
| | |
| 6. База дзейнасці | |
| | |
| 7. Кіраўнік | |
| | |
| 8. Назвы танцаў | |
| | |
| 9. Кантактныя тэлефоны, адрас, эл.адрас | |
| | |
| 10. Фотаздымак танцавальнай пары ў традыцыйным строі | |
| | |

Кіраўнік базавай установы подпіс
Дата